Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры

___________М.А. Яцэвіч
«___»_________________2022 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

_________________Ю.М. Галкоўская
«___»_________________2022 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ГІСТОРЫЯ КНІГІ І КНІЖНАЯ КУЛЬТУРА

*для спецыяльнасці першай ступені вышэйшай адукацыі*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

Складальнік: Н.Ю. Вайцэховіч, дацэнт кафедры ІНАД,
кандыдат педагагічных навук

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта
21.06.2022 г.
пратакол № 12

Мінск 2022

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*Н.Ю. Вайцэховіч,* дацэнт кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Вучоны савет* дзяржаўнай установы "Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі";

*В.А. Касап,* прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНЫ ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*Кафедрай* інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 10 ад 13.05.2022);

*Саветам* факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № ад );

*Саветам* Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (пратакол от 21.06.2022 № 12).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА………………………….……… 4
ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………... 7
Змест вучэбнага матэрыялу…………………………........... 8
Вучэбна-метадычныя карты вучэбнай дысцыпліны ……………. 27

ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ………………………………………… 31
Матэрыялы для правядзення семінарскіх заняткаў……............... 31
Метадычныя парады да семінарскіх заняткаў…………………… 42
Рабочыя матэрыялы да практычных заняткаў…………………… 43

РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ……………………………… 55
Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў…........................................................ 55
Заданні для самастойнай работы студэнтаў …………………….. 56
Графік кантролю за самастойнай работай студэнтаў …………… 67
Прыклады варыянтаў тэставых заданняў ……………………….. 69
Пытанні да заліку ……………………………………………….. 70
Пытанні да экзамену……….................................................................. 72
Тэмы курсавых работ …..…………………………………….. 74
Тэмы дыпломных і магістарскіх работ …………………………... 75
Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў ………………………………………… 77
Крытэрыі ацэнкі ведаў…..………………………………………… 78

ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………................... 81
Літаратура ……………………………………………….………… 81

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс “Гісторыя кнігі і кніжная культура” распрацаваны для падрыхтоўкі студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць.

Вывучэнне гісторыі кнігі і кніжнай культуры спрыяе фарміраванню прафесійнай кнігазнаўчай культуры будучых спецыялістаў сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый і фундаментальных кампетэнцый, неабходных у далейшым для распрацоўкі, курыравання, развіцця і прамоцыі кніжных калекцый. Студэнты інтэнсіўна паглыбляюцца ў гісторыю кнігі і кнігадрукавання, падрабязна спыняючыся на кожным этапе ад фарміравання пісьменства і кнігі да сучасных кніжных і выдавецкіх практык. Асаблівая ўвага надаецца фарміраванню каштоўнасных адносін да кнігі, асэнсаванню нацыянальнай кніжнай культуры як часткі агульначалавечай культурнай спадчыны і здольнасці садзейнічаць яе зберажэнню і развіццю.

**Асноўная мэта засваення вучэбнай дысцыпліны** – фарміраванне ў студэнтаў комплексу фундаментальных ведаў, кагнітыўных і практычных здольнасцяў, неабходных для разумення сутнасці і асноўных этапаў развіцця кнігі ў кантэксце сусветных культурных працэсаў, пашырэння культурнай прасторы беларускай кнігі, папулярызацыі кнігі, чытання і кніжнай культуры у сваёй прафесійнай дзейнасці.

Дасягненне гэтай мэты рэалізуецца праз вырашэнне **наступных задач**:

– характарыстыка гістарычных этапаў развіцця кнігі, вызначэнне асноўных тэндэнцый фарміравання пісьменства і кнігі ад рукапіснай да друкаванай і лічбавай;

– азнаямленне з буйнейшымі цэнтрамі, дзеячамі, помнікамі кніжнай культуры;

– развіццё навыкаў аналізу зместу, матэрыяльнай формы і афармлення кнігі, тыпалагічных, жанравых і тэматычных асаблівасцяў, вызначэння форм і тэхналогій прэзентацыі і прамоцыі кнігі;

– засваенне асноўных накірункаў асэнсавання кніжнай культуры новага часу, набыццё навыкаў аналізу і абмеркавання тэндэнцый развіцця сучаснай беларускай кнігі, чытання і чытацкай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў структуры Тыпавога вучэбнага плана**

Вучэбная дысцыпліна “Гісторыя кнігі і кніжная культура” ўключана ў кампанент установы вышэйшай адукацыі вучэбнага плана факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый для студэнтаў спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць.

Вывучэнне дысцыпліны грунтуецца на веданні асноў сусветнай і беларускай гісторыі, агульнай сусветнай культуры. Асноўныя палажэнні і навыкі, атрыманыя ў выніку асваення гісторыі кнігі і кніжнай культуры могуць быць выкарыстаны ў далейшым пры вывучэнні культуралогіі, філасофіі, эстэтыкі, бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства, бібліятэчна-інфармацыйнага маркетынгу, абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк.

Дысцыпліна змястоўна звязана з такімі курсамі, як “Гісторыя”, “Беларуская літаратура”, “Сусветная літаратура”, “Гісторыя мастацтваў”, “Тэорыя інфармацыі і камунікацыі”, “Дакументалогія”, “Інфармацыйная культура асобы”.

**Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны**

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

***ведаць:***

– гістарычныя ўмовы і этапы развіцця сусветнай і беларускай кнігі, сучасныя падыходы да яе вывучэння;

– структуру кнігі і асноўныя элементы яе мастацкага афармлення;

– асаблівасці розных тыпаў чытання, працэсы і стратэгіі лічбавага чытання, тэхналогіі прафесійнай ацэнкі і развіцця чытацкай культуры.

***умець:***

– характарызаваць асноўныя тэндэнцыі, з’явы, артэфакты і ўнёсак знакамітых дзеячоў кніжнай культуры на розных гістарычных этапах з прымяненнем навуковай тэрміналогіі;

– аналізаваць фармальныя, змястоўныя, прагматычныя аспекты і мастацка-вобразную праграму кнігі як часткі культурнай спадчыны пэўнай эпохі;

– раскрыць і патлумачыць асаблівасці эвалюцыі беларускай кнігі ў кантэксце глабальных культурных і арт-працэсаў, характарызаваць сучасныя практыкі выдання, прамоцыі, распаўсюджання беларускай кнігі.

***валодаць:***

– кнігазнаўчым падыходам да аналізу гісторыі і сучасных тэндэнцый развіцця кнігі і кніжнай культуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– навыкамі рэкамендацыі і абмеркавання кніг і кніжных калекцый, кніжных праектаў і лічбавых кніжных сэрвісаў у адпаведнасці з патрэбамі розных груп чытачоў;

– тэхналогіямі публічнай прэзентацыі і прамоцыі кнігі як аб'екту культуры і мастацтва, раскрыцця нацыянальнай самабытнасці і культурнага патэнцыялу беларускай кнігі.

Дадзеная вучэбная дысцыпліна спрыяе фармаванню наступных кампетэнцый, прадугледжаных Тыпавым вучэбным планам:

**СК-1 –** Характарызаваць гістарычныя ўмовы ўзнікнення пісьменства і кнігі, этапы іх развіцця, найбольш значныя помнікі беларускай і сусветнай кніжнай культуры.

**Агульная колькасць гадзін і колькасць аўдыторных гадзін, адведзеных на вывучэнне дысцыпліны, іх размеркаванне**

Агульны аб'ём курса – 220 гадзін, з іх 130 гадзін – аўдыторныя.

Размеркаванне аўдыторных гадзін: лекцый – 94, семінарскіх – 20, практычных – 16 гадзін. Кантралюемая самастойная работа – 90 гадзін.

Агульная працаёмкасць дысцыпліны – 6 заліковых адзінак.

**Форма атрымання вышэйшай адукацыі** – дзённая, завочная.

**Выніковая форма кантролю** – залік (у першым семестры) і экзамен (у другім семестры).

Вучэбна-метадычны комплекс уключае сістэму дыдактычных сродкаў навучання вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя кнігі і кніжная культура» і дазваляе мадэляваць і арганізоўваць адукацыйны працэс у адпаведнасці з вучэбнай праграмай дысцыпліны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

Для вывучэння і засваення матэрыялу па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя кнігі і кніжная культура” рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя адукацыйныя рэсурсы:

Доўнар, Л. І. Гісторыя беларускай кнігі : вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках) / Л. І. Доўнар ; [сярод рэц. С. А. Паўлава, Т. А. Самайлюк]. - Мінск : БДУКМ, 2012. - 250, [1] с. – Рэжым доступа : http://repository.buk.by:8080/handle/123456789/3371.

Руднев, В. Н. История книжной культуры : учебник для групп направлений бакалавриата «Социология и социальная работа», «Средства массовой информации и информационно-библиотечное дело», «Культуроведение и социокультурные проекты» / В. Н. Руднев. – 2-е изд., перераб. – Москва : Кнорус, 2021. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Уводзіны*

Прадмет, структура, задачы вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя кнігі і кніжнай культуры”, яе месца ў сістэме падрыхтоўкі студэнтаў. Кампетэнцыі, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў, формы кантролю. Вучэбна-метадычная забяспечанасць вучэбнай дысцыпліны.

## Раздзел I. Гісторыя кнігі і кніжнай культуры

*Тэма 1. Гісторыя кнігі як састаўная частка кнігазнаўства.*

*Кніга і яе элементы*

Праблемы вызначэння тэрміна «кніга». Спецыфіка навуковага аналізу кнігі. Сутнасць падыходаў да вывучэння кнігі ў семіётыцы, герменэўтыцы, культуралогіі, тэорыі камунікацый, постструктуралізму. Кнігазнаўчыя інтэрпрэтацыі феномену кнігі. Азначэнне паняцця «гісторыя кнігі», яго змест. Прадмет і метады гісторыі кнігі. Гістарыяграфія і крыніцазнаўства гісторыі кнігі. Навуковыя цэнтры даследавання кнігі.

Узнікненне і развіццё гісторыі кнігі як навукі ў Беларусі. Навуковыя веды пра кнігу ў XII–XIX стст. Першыя комплексныя працы па гісторыі беларускай кнігі. Пытанні гісторыі беларускай кнігі ў працах С. Х. Александровіча, Н. Ю. Бярозкінай, Г. Я. Галенчанкі, А. І. Мальдзіса, М. В. Нікалаева, Я. С. Умецкай і інш. Гісторыя кнігі і кніжнай культуры Беларусі ў працах замежных вучоных.

Матэрыяльны воблік кнігі ў гістарычным развіцці яе асноўных элементаў. Знешнія і ўнутраныя элементы кнігі, іх эвалюцыя і функцыянальнае прызначэнне. Базавыя знешнія элементы: вокладка, пераплёт, супервокладка, форзац, каптал, карэшак, лясэ. Функцыі знешніх элементаў кнігі і іх мастацкае афармленне. Унутраныя элементы кнігі: тытульны ліст, змест, дапаможныя раздзелы, асноўны тэкст, шмуцтытулы, выхадныя даныя, ілюстрацыі, шрыфт. Структура і мастацкае афармленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўнутраных элементаў кнігі. Асаблівасці афармлення рукапіснай кнігі і яе элементы.

### *Тэма 2. Узнікненне і развіццё пісьма*

Азначэнне паняццяў «пісьмо», «пісьменнасць». Сувязь пісьма, мовы і мыслення. Паходжанне пісьма, яго асноўныя этапы.

Першабытныя тыпы пісьма: прадметнае, вузялковае, палачкавае. Піктаграфічнае, логаграфічнае, ідэаграфічнае пісьмо Месапатаміі, Егіпта. Асіра-Вавілонскі клінапіс. Кітайская пісьменнасць. Фанетычнае пісьмо (алфавітна-гукавое).

Паходжанне і развіццё алфавіта. Яго ўдасканаленне ў Грэцыі і распаўсюджанне сярод народаў Усходу і Захаду. Узнікненне лацінскага алфавіта. Пісьмо ўсходніх славян у дахрысціянскі перыяд.

Развіццё пісьма на старажытнабеларускіх землях. Кірыліца і глаголіца. Роля Кірылы і Мяфодзія ва ўніфікацыі сістэмы пісьма ва ўсходнеславянскіх, паўднёва- і заходнеславянскіх народаў. Значэнне хрысціянства ў распаўсюджанні кірылічнага алфавіта. Найранейшыя сведчанні кірылічнага пісьма на тэрыторыі Беларусі.

### *Тэма 3. Кніга Старажытнага Усходу*

Перадумовы ўзнікнення кнігі. Эпіграфічныя помнікі культуры. Культура старажытнага Шумера. Гліняныя таблічкі з гарадоў Ура і Кіша. З'яўленне дакументаў на шумерскай мове, іх змест. Асіра-Вавілонія – спадчынніца шумерскай культуры. Асірыйскія кнігі і бібліятэкі. Асноўны матэрыял для пісьма.

Значэнне кнігі і яе сувязь з культавымі вераваннямі егіпцян. Становішча жрацоў-пісцоў. Пісьмёны на прадметах ужытку. Асаблівасці формы кнігі ў Егіпце. Асноўны матэрыял і інструменты для пісьма. Захоўванне кніг. Уплыў укаранення пісьма на развіццё літаратурнай мовы, старажытнай навукі. Зараджэнне пісьма ў Індыі. Развіццё пісьма брахмі. Разнастайнасць матэрыялу для пісьма. Старажытныя помнікі пісьменства Індыі, іх шматмоўнасць. Свяшчэннасць кніг Індыі (Веды). Росквіт культуры Старажытнага Кітая. Першыя іерогліфы эпохі дынастыі Шан (XIV–XI стст. да н. ч.). Развіццё пісьменства ў эпоху Чжоу (XII–III стст. да н. ч.). Матэрыял для пісьма. Вынаходніцтва паперы. Роля будызму і канфуцыянства ў распаўсюджанні кнігапісання. Уплыў кітайскай культуры на зараджэнне іерагліфічнай сістэмы пісьма ў суседніх народаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Кніга ў антычным грамадстве*

Значэнне антычнай культуры Грэцыі. Агульнадаступнасць мастацтва пісьма. Фінікійскі алфавіт і “бустрафедон”. Росквіт рабаўладальніцкага грамадства Грэцыі. Развіццё грэчаскай ідэалогіі, філасофіі, адукацыі, мастацтва і літаратуры. Роля рэлігіі ў антычным грамадстве. Александрыйскі мусеён і развіццё антычнай навукі. Змены ў форме рукапісаў і матэрыяле для пісьма. З’яўленне новых прафесій у галіне кніжнай справы. Развіццё кніжнага гандлю, бібліяфільства.

Росквіт лацінскага пісьменства ў эпоху Рымскай рэспублікі і ранняй імперыі. Старажытнейшыя помнікі пісьма на лацінскай мове. Разнастайнасць матэрыялаў для пісьма. Узнікненне ўнцыялу і курсіву. Развіццё кніжнага гандлю і бібліяфільства ў Рыме. Выкарыстанне працы рабоў у кніжнай справе. З’яўленне прататыпаў газеты («Acta senatus», «Acta diurna urbis»). Першыя ганенні на кнігі.

*Тэма 5. Кніга ў эпоху Сярэднявечча*

Сацыяльна-культурныя працэсы ў эпоху Сярэднявечча. Роля рэлігіі і царквы. Манастырскія скрыпторыі і бібліятэкі. Узнікненне ўніверсітэтаў. З’яўленне рукапісаў на народных мовах. Першы індэкс забароненых кніг.

Распаўсюджанне лацінскіх манускрыптаў у Англіі, Францыі і Германіі. Узнікненне прадпрыемстваў мануфактурнага тыпу працоўка заходнееўрапейскіх шрыфтоў: “каралінгскі мінускул”, гатычны стыль. Арабскі Усход і перайманне антычнай спадчыны. Рэпертуар рукапісных кніг у Кітаі і Японіі. Значэнне рэлігійнай кнігі. Форма кнігі і асаблівасці яе мастацкага афармлення. Палімпсесты. Асноўныя тыпы кнігі, яе прызначэнне, змест. Асаблівасці афармлення рукапісных кніг. Пачатак вырабу і распаўсюджанне паперы. Разнастайнасць жанраў рукапіснай кнігі. Ілюстраванне рукапісных кніг і мастацтва каліграфіі. Мініяцюра.

*Тэма 6. Кніга на тэрыторыі Усходняй Еўропы і Старажытнай Русі*

Рукапісная кніга Візантыі і традыцыі грэчаскай кніжнай культуры. Роля хрысціянства ў распаўсюджанні рэлігійнай літаратуры. Ужыванне кніжнага курсіву. Мастацтва рукапіснай кнігі. Уплыў візантыйскай кніжнай культуры на развіццё еўрапейскай, славянскай кнігі, кнігі народаў Каўказа. Рукапісная кніга Венгрыі і Польшчы. Пісьмовыя помнікі. Развіццё славянскага пісьменства. Цэнтры вытворчасці рукапісных кніг у Балгарыі і Румыніі. Помнікі кніжнага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фарміраванне першых дзяржаў і распаўсюджанне хрысціянства ў Старажытнай Русі. Зацвярджэнне кірылічнага алфавіта. Тыпы кірылічнага пісьма. Манастырскія і дзяржаўныя скрыпторыі. Разнастайнасць тэматыкі і тыпаў кніг. Распаўсюджанне кніжнай спадчыны з Балгарыі і Візантыі. Стварэнне арыгінальных помнікаў пісьменства. Буйнейшыя цэнтры асветы і кніжнасці Старажытнай Русі (Кіеў, Ноўгарад, Смаленск, Полацк, Тураў і інш.). Распаўсюджанне пісьменства сярод розных сацыяльных пластоў грамадства. Помнікі эпітафікі. Берасцяныя граматы. Найранейшыя кніжныя помнікі. Першыя спісы забароненых кніг. "Кніжнікі" Старажытнай Русі. Яраслаў Мудры і распаўсюджанне асветы.

*Тэма 7. Кніга Беларусі часоў Полацкага і Тураўскага княстваў*

Рэпертуар рукапіснай кніжнасці. Асноўныя тыпы рукапіснай кнігі. Старажытныя богаслужбовыя і рэлігійныя чытальныя кнігі. Паўсвецкія кнігі і іх характарыстыка. Мова старажытных кніг. Асоба аўтара старажытных кніг.

Помнікі кніжнай культуры Беларусі. Дзейнасць беларускіх асветнікаў Клімента Смаляціча, Кірылы Тураўскага, Аўраамія Смаленскага, Ефрасінні Полацкай.

Тураўскае Евангелле, Аршанскае Евангелле, Полацкія Евангеллі, Слуцкі Псалтыр, "Парэнэсіс" Яфрэма Сірына, "Лесвіцы" Іаана Лесвічніка, "Жыціе Кірылы Тураўскага" і іншыя кніжныя помнікі богаслужбовага і рэлігійна-навучальнага зместу. Летапісныя помнікі старажытнай Беларусі і іх характарыстыка. Справаводнае пісьменства (смаленскія і полацкія граматы).

*Тэма 8. Рукапісная кніга Вялікага Княства Літоўскага*

Сацыяльна-культурныя ўмовы развіцця беларускай рукапіснай кнігі ў ВКЛ. Пашырэнне сувязей з Заходняй Еўропай. Беларускае Адраджэнне і рукапісная кніга. Буйнейшыя цэнтры пісьменства. Тыпы скрыпторыяў ВКЛ – цэнтраў масавай вытворчасці рукапіснай беларускай кнігі. Узнікненне паперняў. Стылі афармлення беларускіх рукапісаў.

Асноўныя тыпы рукапіснай кнігі ВКЛ. Вядомыя кніжныя помнікі. Стварэнне рукапісаў для каталіцкай, іўдзейскай, мусульманскай канфесій. Мова, графіка, форма кнігі. Месца ў рэпертуары беларускіх рукапісных кніг патрыстыкі і агіяграфіі, павучальных зборнікаў, палемічных твораў. Цэнтры летапісання. Дзяржаўныя летапісныя зводы. Польскамоўныя хронікі. Узнікненне новых жанраў мясцовага летапісання – дыярыушаў і хранографаў. Рукапісныя кнігі дзелавога і практычнага прызначэння:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

юрыдычныя і гаспадарча-справаводныя. Рукапісы ўтылітарнага зместу. Пераклады мастацкай літаратуры. Рыцарскія раманы, аповесці, інтэрмедыі. Рукапісныя зборнікі.

### *Тэма 9. Узнікненне і распаўсюджанне кнігадрукавання ў эпоху Адраджэння (XV – першая палова XVII ст.)*

Перадгісторыя кнігадрукавання. Выкарыстанне ксілаграфіі ў Антычнасці. Кітайскае кнігадрукаванне. Першыя друкаваныя кнігі Японіі.

Сацыяльна-эканамічныя і культурныя перадумовы ўзнікнення кнігадрукавання ў Заходняй Еўропе. Распаўсюджанне ксілаграфіі. Вынаходніцтва кнігадрукавання ў Германіі. Дзейнасць Іагана Гутэнберга і яго паслядоўнікаў. Першыя друкаваныя кнігі ў Англіі. Дзейнасць універсітэцкіх друкарняў. Умовы развіцця кнігавыдання ў Італіі. З'яўленне антыквы. Дзейнасць выдавецкай фірмы Альдаў. Кнігавыданне ў Нідэрландах (Лаўрэнса Янсзон Костэр). Друкарня Крыстофера Плантэна. Амстэрдам як еўрапейскі цэнтр гандлю і друку. Дзейнасць Эльзевіраў. Распаўсюджанне пратэстантызму ў Францыі. Выдаўцы-гуманісты Эцьены, Эцьен Дале. Узнікненне дзяржаўных тыпаграфскіх прадпрыемстваў. Цэнзура друкаваных кніг. З'яўленне першых газет.

Першыя друкаваныя кнігі Усходняй Еўропы (Польшча, Чэхія, Венгрыя, Румынія). Тэматыка, тыпы і мова кніжных выданняў. Выдавецкая дзейнасць Швайпольта Фіёля. З'яўленне кнігадрукавання ў Маскоўскай дзяржаве. Ананімныя выданні. Арганізацыя "Друкарскага Двара". Дзейнасць Івана Фёдарава, Пятра Мсціслаўца і іх паслядоўнікаў. Арганізацыя «Верхняй друкарні». Роля беларускага асветніка Сімяона Полацкага. З'яўленне «Курантаў». Выданне вучэбнай літаратуры. Дзейнасць Васілія Бурцава-Пратапопава.

Развіццё кнігадрукавання ў Японіі. Прыватныя друкарні. Мова выданняў. Пачатак кнігадрукавання ў Паўночнай Амерыцы. Дзейнасць друкарні ў Бостане. Тэматыка выданняў.

Інкунабулы і палеатыпы. Асаблівасці мастацтва кнігі.

### *Тэма 10. Узнікненне беларускага кнігадрукавання. Дзейнасць Францыска Скарыны і яго кніжная спадчына*

Культурна-гістарычны кантэкст дзейнасці Францыска Скарыны. Росквіт беларускай кніжнай культуры. Фактары, якія садзейнічалі ўзнікненню беларускага кнігавыдання. Выдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны. Пражскі перыяд. Кнігі Бібліі Ф. Скарыны. Прадмовы, сказанні і пасляслоўі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мастацкае афармленне кніг. Віленскі перыяд. “Малая падарожная кніжка”: склад, змест, асаблівасці афармлення. “Апостал”. Мова выданняў. Мастацтва кніг Ф. Скарыны: шрыфты, паліграфічная арганізацыя тэксту, колеры, ілюстрацыі, арнаментальныя ўпрыгожванні.

Грамадскія і філасофскія погляды першадрукара. Гуманістычны і асветніцкі патэнцыял дзейнасці Ф. Скарыны. Выданні Скарыны ў кнігасховішчах свету. Загадкавыя і спрэчныя факты ў даследаванні жыцця і дзейнасці Ф. Скарыны. Лепшыя навуковыя і навукова-папулярныя кнігі, прысвечаныя асобе, дзейнасці і спадчыне Ф. Скарыны.

*Тэма 11. Дзейнасць паслядоўнікаў Францыска Скарыны (XVI – першая палова XVII ст.)*

Паслядоўнікі Ф. Скарыны і развіццё прыватнага кнігавыдання. Распаўсюджанне рэфармацыйнага руху. Фундатары друкарняў. Дзейнасць друкарняў у Брэсце. Брэсцкая Біблія (Радзівілаўская). Нясвіжская друкарня. Дзейнасць С. Буднага. «Катэхізіс», «Аб апраўданні грэшнага чалавека перад Богам». «Евангелле» Васіля Цяпінскага. Дзейнасць Заблудаўскай друкарні. Роля Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца. «Астрожская Біблія».

Люблінская (1569) і Брэсцкая (1596) уніі, іх уплыў на змены ў кнігавыданні. Узнікненне друкарняў каталіцкіх і ўніяцкага ордэнаў. Адраджэнне кірылічнага кнігадрукавання ў Вільні. Дзейнасць друкарні «Дом Мамонічаў».

Асветніцкая дзейнасць брацкіх друкарняў у Вільні, Еўі, Куцейне, Магілёве. Іх роля ў развіцці кірылічнага беларускамоўнага кнігадрукавання. Дзейнасць Спірыдона Собаля. Захаванне і развіццё традыцый кнігадрукавання Ф. Скарыны. Кніга ва Украіне. Дзейнасць друкарняў у Кіеве, Чарнігаве. Перасоўныя друкарні Кірылы Стаўравецкага і Паўла Дамжыва-Лютковіча. Тэматыка выданняў.

Вядучая роля беларускай кніжнасці ва ўсходнеславянскай культуры XVI – пачатку XVII ст. З’яўленне ў ВКЛ першых газет-аднадзёнак і календароў. Мастацкае афармленне старадрукаў. Віленская гравёрная школа.

*Тэма 12. Выдавецкая дзейнасць у Беларусі ў межах Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай (другая палова XVII–XVIII ст.)*

Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі. Узмацненне ўплыву каталіцкай царквы на духоўнае жыццё ВКЛ. Пастанова Канфедэрацыйнага сойма аб увядзенні польскай мовы ў дзяржаўнае справаводства (1696).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя кірункі кнігадрукавання. Заняпад брацкага кнігадрукавання. Дзейнасць Магілёўскай брацкай друкарні і Максіма Вашчанкі.

Распаўсюджанне контррэфармацыі. Дзейнасць друкарняў каталіцкіх ордэнаў (езуітаў, францысканцаў, піяраў). Кнігавыдавецкая дзейнасць уніяцкага (базыльянскага) ордэна ў Вільні і Супраслі.

Дзейнасць прыватных друкарняў у Вільні. Радзівілаўскія друкарні ў Любчы, Слуцку, Кейданах, Нясвіжы. Прыватныя друкарні ў Ашмянах, Слоніме. Выпуск свецкай літаратуры. Змены ў яе тэматыцы. Мова выданняў.

Прадпрыемствы дзяржаўнага характару: Магілёўская прыдворная друкарня, Гродзенская каралеўская друкарня. Яўрэйскія друкарні.

Развіццё перыядычнага друку. «Літоўскі кур'ер», «Гродзенская газета», «Гродзенскія ведамасці», «Гродзенскія весці». Друк і распаўсюджанне календароў. Мастацкае афармленне старадрукаў. Віленская і Магілёўская гравёрныя школы. Замежныя гравёры.

*Тэма 13. Кніга і кніжная культура ў эпоху Асветніцтва*

Роля кнігі ў эпоху Асветніцтва. Развіццё друкарскай справы і кніжнай графікі. Рэформы ў кнігадрукаванні. Аўтарскае права і цэнзура. Спецыялізацыя выдавецтваў. Тэматыка і тыпы выданняў. Энцыклапедычныя выданні і выданні «кішэннага» фармату.

Асноўныя цэнтры кнігадрукавання ў Заходняй Еўропе. Арыстакратычная кніга. Асветніцкая і агітацыйная літаратура. Выпуск кніг на нацыянальных мовах. Развіццё перыядычнага друку. Узнікненне кнігавыдавецкіх кампаній. Прафесійныя аб'яднанні. Кнігадрукаванне ў Францыі. Дзейнасць П. Фурнье і Ф. Дзідо. Выраб стэрэатыпаў. Вялікая французская буржуазная рэвалюцыя і змены ў друку. Словалітні Галандыі. Вытворчасць геаграфічнай літаратуры. Змены ў дзейнасці Эльзевіраў. Адносіны паміж аўтарам і выдаўцом у Англіі. Фарміраванне новага тыпу выданняў («бук трэйд»). Буйнейшыя італьянскія выдаўцы. Роля Д. Бадоні. Рэгламентацыя кніжнай справы ў Германіі. Выданне літаратуры для дзяцей. Заснаванне альманахаў. Мастацтва кнігі.

Кніжная справа ў ЗША. Дзейнасць Б. Франкліна. Тэматыка і тыпы выданняў.

Кніжная справа ва Усходняй Еўропе. Кніга і царква. Уплыў асветніцтва. Кніга ў Расіі. Пераўтварэнні Пятра I у кніжнай справе Расіі. Кнігі грамадзянскага друку. Дзейнасць беларуса Ільі Капіевіча. Дзейнасць друкарняў у Маскве і Пецярбургу. Палітыка Кацярыны II і друк. Вольныя друкарні. Узнікненне прыватных выдавецтваў. Дзейнасць М. Навікова,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. Радзішчава. Цікавасць да французскай кнігі. Узнікненне навуковых і сатырычных перыядычных выданняў. Мастацкае афармленне кнігі.

### *Тэма 14. Кніга і кніжная культура ў эпоху Новага часу (XIX – пачатак XX ст.)*

Сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя ўмовы развіцця кнігі і друку. Індустрыялізацыя кніжнай вытворчасці. Узнікненне новых спосабаў кнігадрукавання: плоскага друку (літаграфіі), ратацыйных тыпаграфскіх машын. Распаўсюджанне масавых і малафарматных выданняў. Прафесійныя аб’яднанні.

Развіццё кнігавыдання ў Заходняй Еўропе. Дзейнасць буйнейшых выдавецтваў у Вялікабрытаніі. Парыжская камуна і характар друку. Выданне класікаў нямецкай і сусветнай літаратуры ў Германіі. «Бібліяграфічны інстытут». Сацыял-дэмакратычны кірунак у выдавецкай справе. Стварэнне нацыянальнага рынку ў Італіі. Выдавецтвы ўніверсальнага характару. Спецыяльныя выданні па кнігазнаўстве і бібліяграфіі.

Развіццё кнігі ў краінах Усходняй Еўропы. Нацыянальна-вызваленчы рух і выдавецкая справа. Асаблівасці і развіццё нацыянальнага друку і кнігі ў Балгарыі, Венгрыі, Румыніі, Польшчы. Рост попыту на кнігу ў Расіі. Цэнзурная палітыка. Дзейнасць «казённых» і прыватных друкарняў. Выданні дзекабрыстаў. Выдавецкая дзейнасць універсітэтаў. Узнікненне рэвалюцыйна-дэмакратычнага кнігавыдання. Дзейнасць універсальных і спецыялізаваных выдавецтваў. «Народныя» выданні.

Перыядычныя выданні. Дэмакратычны друк Расіі, Украіны, Літвы. Узнікненне газетных выданняў на нацыянальных мовах. Асноўныя кірункі развіцця кніжнай справы ў ЗША. Заснаванне прафесійных аб’яднанняў. Манапалізацыя выдавецкіх фірм. «Закон аб аўтарскім праве». Тэматыка і тыпы кніг. Асаблівасці кніжнай вытворчасці ў Японіі. Укараненне шрыфтавога друку. Міжнародныя кантакты.

### *Тэма 15. Кніга Беларусі ў перыяд Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.)*

Фарміраванне капіталістычных адносін, нацыянальнай свядомасці. Этапы беларускага кнігавыдання. Цэнзурнае становішча. Нацыянальна-вызваленчы рух і выдавецкая справа. Цэнтры кнігавыдання. Асноўныя тэндэнцыі развіцця кніжнай справы. Змены ў тыпах выдавецкіх прадпрыемстваў і рэпертуары кніжнай прадукцыі. Царкоўныя друкарні. Дзяржаўныя, грамадскія і прыватныя кнігавыдавецтвы. Вінцэнт Дунін-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Марцінкевіч і выданне кніг на беларускай мове. Асноўная тэматыка, тыпы і мова кніжных выданняў.

Перыядычны друк Беларусі. Часопіс «Полацкі месячнік». «Губернскія ведамасці», «Епархіяльныя ведамасці». Узнікненне галіновых часопісаў. Нелегальныя перыядычныя выданні: «Гутарка двух суседаў», «Мужыцкая праўда» (К. Каліноўскі). Нелегальныя выданні народнікаў. Грамадска-палітычная газета «Мінскі лісток».

Друк беларускамоўных твораў за межамі Расійскай імперыі. Гісторыя выдання твораў Францішка Багушэвіча.

Адраджэнне беларускамоўнага друку ў пачатку XX ст. Дзейнасць «Круга беларускага», выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца», Антона Грыневіча, «Грамады» ў С.-Пецярбургу. Першыя легальныя газеты на беларускай мове («Наша Доля», «Наша Ніва») і іх роля. Віленскія выдавецтвы «Наша Ніва», «Наша хата», «Палачанін», «Беларускае выдавецкае таварыства»; мінскія – «Мінчук», «Саха», «Лучынка», «Вольная Беларусь». Асаблівасці развіцця беларускамоўнага друку. Мастацтва афармлення беларускай кнігі.

*Тэма 16. Кніга ў эпоху Навейшага часу (першая палова XX ст.)*

Агульны характар кніжнай вытворчасці ў капіталістычных краінах. Асноўныя этапы. Тэхнічны прагрэс у паліграфіі: афсет, фотанаборныя машыны, электрычныя паліграфічныя машыны. Развіццё спосабу шматколернага друку.

Манапалізацыя, канкурэнцыя, колькасны рост друкаванай прадукцыі ў краінах Заходняй Еўропы (Вялікабрытанія, Германія, Італія, Францыя). Універсальныя і спецыялізаваныя выдавецтвы. Навукова-папулярныя выданні «кішэннага» фармату. Антыфашысцкія і эмігранцкія выданні. Пасляваенная індустрыялізацыя.

Кнігадрукаванне ў краінах Усходняй Еўропы. Адраджэнне дзяржаўнасці і нацыянальнай незалежнасці. Эканамічны і культурны пад’ём. Перадваенная манапалізацыя выдавецкай дзейнасці. Сацыялістычны друк. Цэнзура. Кніжная справа ў гады вайны. Акупацыйны, падпольны і эміграцыйны друк.

Кніга ў Расіі пасля 1905 г. Змены ў цэнзуры друку. Выданне палітычнай і навукова-тэхнічнай літаратуры. Першыя нацыянальныя энцыклапедыі. Кірункі развіцця кніжнай справы пасля 1917 г. Нацыяналізацыя і цэнтралізацыя кнігавыдання, кнігараспаўсюджання. Спецыфіка перадваеннага друку. Малыя формы выданняў. Рускі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эміграцыйны друк. Арганізацыя друку ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Узнаўленне выдавецкай справы ў пасляваенны перыяд. Выдавецкая справа народаў СССР.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё ЗША і кніжная справа. Цэнтры кніжнай справы. Роля «кніжных клубаў». Экспарт кнігі. Распаўсюджанне выданняў тыпу «покет-бук» і «пэйпер-бук».

Развіццё паліграфічнай базы Японіі. Выданне таннай літаратуры. Заняпад кніжнай справы пасля Другой сусветнай вайны. Асацыяцыя выдаўцоў.

Асаблівасці афармлення кнігі.

*Тэма 17. Кніга Беларусі ў 1918–1991 гг.*

Асноўныя этапы беларускага кнігавыдання. Змены ў кніжнай справе Беларусі пасля 1917 г. Партыйны друк. Кніжная справа БНР. Нацыяналізацыя і арганізацыя дзяржаўнага кнігавыдання ў савецкай Беларусі. Кантроль друку. Дзяржаўнае выдавецтва БССР, кааператыўныя выдавецтвы «Адраджэнне», «Уперад». Палітыка беларусізацыі і кніга. Дзейнасць Зміцера Жылуновіча. Цэнтралізацыя кнігавыдання.

Кнігавыдавецкая справа ў Заходняй Беларусі ў складзе ІІ Рэчы Паспалітай. Структура і асаблівасці кніжнай справы. Роля прыватных выдавецтваў. Тэматыка і віды выданняў. Асаблівасці кнігавыдавецкай дзейнасці ў міжваенны час на этнічных беларускіх землях. Роля кнігі ў захаванні беларускай культуры.

Выдавецкая дзейнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны. Акупацыйны, падпольны і тылавы друк. Дзейнасць Дзяржаўнага выдавецтва БССР («Савецкая Беларусь»), выдавецтва АН БССР. Сатырычны друк. Рукапісная перыёдыка.

Узнаўленне выдавецкай справы ў пасляваенны перыяд. Асноўныя кірункі развіцця. Стварэнне новых дзяржаўных выдавецтваў і вызначэнне іх спецыялізацыі. Органы кіравання выдавецкай справай. Тэматыка і віды выданняў. Першая ўніверсальная энцыклапедыя Беларусі. Выданне твораў беларускай і замежнай мастацкай літаратуры, літаратуры для дзяцей і юнацтва. Рэспубліканскі конкурс «Мастацтва кнігі». Беларуская кніга на міжнародных выстаўках.

Перыядычны друк. Выпуск газет і часопісаў. Узнікненне самвыда. Беларускі эміграцыйны друк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 18. Сусветная і беларуская кніга найноўшага часу*
*(другая палова XX – пачатак XXI ст.)*

Сацыяльна-эканамічныя і культурныя ўмовы. Пашырэнне працэсу манапалізацыі ў сферы выдавецкай вытворчасці краін Заходняй Еўропы. Асноўныя тыпы выдавецкіх прадпрыемстваў. Рэпертуар кніжных выданняў. Буйнейшыя кампаніі Вялікабрытаніі, Германіі, кнігавыдавецкія канцэрны Італіі, Галандыі («Н. В. Эльзевір»), Францыі («Кніжная справа Ашэт», «Груп дэ ля Сітэ», «Фламарыён» і інш.). Спецыфічныя рысы выдавецкай сістэмы ЗША. Вучэбная, энцыклапедычная літаратура, рэпрынты, коміксы, бук дайджэсты. Кніжныя традыцыі ў Японіі. Рост чытацкіх запатрабаванняў. Павелічэнне выданняў тыпу «манга». Кніга ў краінах Усходняй Еўропы (Балгарыя, Венгрыя, Польшча, Румынія).

Кніга ў СССР. Перабудова кніжнай справы ў 1960-я гг. Спецыялізацыя ў дзяржаўным кнігавыданні. Выданне навуковай, энцыклапедычнай, серыяльнай і масавай літаратуры. Асноўныя тэндэнцыі выдання ў СССР. Эканамічны і палітычны крызіс 1980-х гг. Перабудова і змены ў кнігавыданні. Тэматыка-тыпалагічны склад кніжнага патоку. Цэнтры кнігавыдання Расіі. Універсальны і шматпрофільны кірункі ў дзейнасці выдавецтваў. Буйнейшыя прыватныя кампаніі. Характэрныя рысы кнігавыдання краін СНД.

Абнаўленне і адраджэнне сістэмы беларускага кнігавыдання. Узнікненне прыватных выдавецтваў. Дэманапалізацыя дзяржаўнага кнігавыдання. Выдавецкая справа на шляху да якаснай мадэлі кніжнай вытворчасці. Тэматыка і віды выданняў. Выданне сацыяльна значнай літаратуры. Рэарганізацыя сістэмы дзяржаўнага кнігавыдання. Канцэнтрацыя кніжнай вытворчасці ў буйнейшых прыватных выдавецтвах. Стварэнне і распаўсюджанне электронных кніг і аўдыятэкстаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Сучасная кніжная культура

*Тэма 19. Міждысцыплінарныя падыходы да даследавання*
*сучаснай кніжнай культуры*

Сучасная кніжная культура як міждысцыплінарны феномен. Сутнасныя характарыстыкі кніжнай культуры і падыходы да яе вызначэння. Элементы кніжнай культуры. Культура кнігі і кніжная культура: узаемасувязь і спецыфіка. Корпус тэкстаў і ідэй, якія задаюць сучасныя ракурсы вывучэння кніжнай культуры. Асэнсаванне феномену кніжнай культуры ў работах К. Міганя, Л.І. Доўнар, М.В. Нікалаева, В.М. Герасімава, М.А. Мажэйка,

У.І. Васільева, Б.У. Ленскага, Н.В. Лапацінай і інш. Асноўныя падыходы да вывучэння гісторыі і сучасных тэндэнцый развіцця кніжнай культуры: кнігазнаўчы, культуралагічны, дакументаграфічны, літаратуразнаўчы, гістарыяграфічны і інш.

Праблематыка сучасных даследаванняў кніжнай культуры. Праекты, навуковыя форумы і выданні ў сферы кніжнай культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Беларускія даследчыкі кніжнай культуры: Л.І. Доўнар, Р.С. Матульскі, В.М. Герасімаў, М.В. Нікалаеў, Л.Г. Кірухіна, А.А. Суша, Т.І. Рошчына, Ю.М. Лаўрык, Т.А. Самайлюк, Л.А. Аўгуль, Н.Ю. Бярозкіна і інш.

Трансфармацыі сучаснай кніжнасці і міждысцыплінарныя арыентыры даследаванняў кніжнай культуры.

*Тэма 20. Кніжная культура ў кантэксце сусветных культурных працэсаў*

Прынцыпы культуралагічнага аналізу феномену кнігі. Кніга як культурны сімвал. Вусны, пісьмовы, друкаваны, электронны тэкст: змена культурных эпох і пашырэнне камунікатыўных магчымасцяў. Чалавек рукапіснай і чалавек друкарскай культуры. Кніга ў масавым грамадстве. Экспансія электронных сродкаў камунікацыі. Радыё, кіно і тэлебачанне і іх уплыў на аўдыторыю. Параўнанне кніжнага тэксту і тэлетэксту. Кніга як форма індывідуальнага канструявання сэнсаў. Тэлебачанне як “машына сэнсаў”. Спецыфіка ўвагі і ўспрымання гледача і чытача. Сацыяльныя групы і аўдыторыі кнігі.

Канцэпцыі “мазаічнай” культуры і станаўленне інфармацыйнага грамадства. Адлюстраванне, рэпрэзэнтацыя і канструяванне сэнсаў у эпоху Інтэрнэта. Прыватызацыі інфармацыйнай прасторы. Кніга як інфармацыйны і культурны прадукт. Кніга ў лічбавай цывілізацыі. Медыйная канцэпцыя кнігі. Канцэпцыі культурнага дагматызму, канфармізму, электызму, дынамізму і адпаведныя мадэлі кніжнай культуры.

*Тэма 21. Феномен кнігі і кніжнай культуры ў постмадэрнізму*

Прадумовы фарміравання постмадэрнісцкай мадэлі асэнсавання кнігі. Постмадэрнісцкія арыентацыі і праявы новай кніжнай культуры: “постмадэрнісцкая адчувальнасць” (семантычны хаос), свет як тэкст, адкрытасць значэння, замена рэальнасці знакам рэальнасці (Ж. Бадрыяр), апавядальная (наратыўная) стратэгія і прынцыповая плюральнасць як аснова сучаснай культуры. Дэструкцыя канцэпцыі элітарнай і масавай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інтэрпрэтацыя феномену кнігі ў культуры постмадэрна. “Кніга-лукавіца” як рызаморфны аб’ект (Ж. Дэлёз і Ф. Гваттары). Праблема суадносінаў кнігі і тэксту. Кніга як “адкрытае поле сэнсаў”, шматслойны і семіятычна неаднародны тэкст. Структурная і семантычная варыябельнасць тэксту, “невырашальнасць” (Р. Барт), “рассейванне” (Ж. Дарыда). Крэатыўны патэнцыял самаарганізацыі тэкста. Паняцце азначвання (Ю. Крысцева) і працэсы сэнсаўтварэння ў філасофіі постмадэрнізма. Камунікатыўная сутнасць кнігі: “вось незлічоных адносін” (Х.Л. Борхес). Кніга як бясконцае падарожжа, “акіян гісторый” (М. Бютор).

Трансфармацыя мадэлі камунікацыі “аўтар-тэкст-чытач” у сучаснай кніжнай культуры.

Рызаморфныя вобразы кнігі і бібліятэкі ў постмадэрнісцкай літаратуры (В. Ластоўскі “Лабірынты”, У. Эка “Імя розы”, Э. Костава “Гісторык” і інш.).

*Тэма 22. Беларуская кніга ў новай культурнай сітуацыі*

Беларуская кніга як нацыянальны праект. Падыходы да вызначэння паняцця беларускай кнігі, нацыянальнага дакументу (В. Е. Лявончыкаў, Л.І. Доўнар, Т.В. Кузьмініч, В.М. Герасімаў і інш.). Беларуская кніга як універсум нацыянальнай культуры (Л.І. Доўнар).

Культурныя працэсы, характэрныя для постіндустрыяльнага грамадства. Камерцыяналізацыя беларускай культуріндустрыі. Працэсы глабалізацыі і іх уплыў на кніжны рынак. Роля дзяржавы ў развіцці культурнага і арт-асяроддзя беларускай кнігі: сферы рэгуляцыі і самарэгуляцыі. Ліцэнзаванне выдавецкай дзейнасці. Закон Рэспублікі Беларусь аб друку і СМІ. Культурныя і сацыяльныя ініцыятывы ў сферы выдання, прамоцыі і распаўсюджвання беларускай кнігі. Паняцце культурнага мейнстрыма ў кніжнай культуры. Поп-культура ў постмасавым грамадстве, яе віды і характарыстыкі. Статус кніжнага артхауса і інтэлектуальнай кніжнай культуры.

Новыя тыпы нацыянальнай культуры. Кніжны праект у пошуках аўтара. Нацыянальныя ўвасабленні глабальных трэндаў. Фармальныя і нефармальныя плыні кніжнай культуры. Сучасныя дыскусіі вакол паняцця беларускага аўтара. Суб’екты і аўдыторыі кніжнай індустрыі. Уплыў глабальнай кніжнай індустрыі на беларускі рынак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 23. Беларуская кніга ў сучасным літаратурным і выдавецкім працэсе. Асаблівасці кніжнага гандалю*

Агульная характарыстыка сучаснага літаратурнага працэсу. Рэалізм, мадэрн і постмадэрн у сучаснай беларускай літаратуры. Трансфармацыя ролі і функцый літаратуры і кнігі.

Літаратурныя аб'яднанні, рэгіянальныя і мясцовыя літаратурныя суполкі. Асноўныя літаратурна-мастацкія выданні і выдавецкія праекты канца XX–пачатку XXI ст.ст. Славутыя кніжныя праекты новага часу: аўтарскія, калектыўныя выданні і серыі.

Беларускія выдавецтвы і кнігарні: сучаныя тэндэнцыі развіцця. Паслугі і накірункі дзейнасці сучасных выдавецтваў. Тэхналогія выдання кнігі: перадвыдавецкая падрыхтоўка (літаратурная і навуковая рэдактура, карэктура, афармленне паказальнікаў, дызайн вокладак), макетаванне і друк.

Дзейнасць вядучых дзяржаўных выдавецтваў («Народная асвета», «Вышэйшая школа», «Мастацкая літаратура», «Беларуская энцыклапедыя», «Беларусь», «Беларуская навука»). Асноўныя кірункі дзейнасці недзяржаўных выдавецтваў («Тэхналогія», «Кнігазбор», «Харвест», «Папуры», «Аверсэв», «Кніжны Дом», «Амалфея» і інш.).

Асаблівасці развіцця перыядычнага друку.

Спецыфіка кніжнага рынку і яго асноўныя сегменты. Актуальныя трэнды сусветнага і беларускага кніжнага рынку. Лепшыя беларускія кнігарні: фарматы, спецыялізацыя, асартымент, дызайн, праекты. Сеткавыя беларускія кнігарні. Кніжныя анлайн-праекты. Беларуская электронная бібліятэка "Беларуская палічка". Праект "Фрагменты беларускіх кніг". Інтэрнэт-крама беларускай кнігі "KNIHI.BY": прынцыпы дзейнасці і функцыянал. Кніжныя ярмаркі. Беларуская літаратурная крытыка, літаратурныя і кніжныя рэцэнзіі і агляды. Беларускія кніжныя блогеры.

*Тэма 24. Дызайн кнігі*

Кніга як прадмет мастацтва і паліграфіі. Паняцце і спецыфіка кніжнага дызайну. Суадносіны паняццяў "кніжны дызайн", "мастацтва кнігі", "графічнае афармленне", "тыпаграфіка", "мастацкае канструяванне кнігі". Функцыянальны, эстэтычны і тэханалагічны фактары кніжнага дызайну. Патрабаванні да знешняга і ўнутранага афармлення кнігі. Алгарытмы і прыёмы распрацоўкі кніжнага дызайну. Кампазіцыя кнігі. Афармленне вокладкі. Падрыхтоўка дызайн-шаблону вёрсткі ўнутранага блоку.

Этапы афармлення кнігі: стварэнне макету, вёрстка, дызайн форзацу, тытульны ліста, малюнкаў, развароатаў і падзельнікаў раздзелаў. Дызайн кнігі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў залежнасці ад тэматыкі: асаблівасці афармлення навуковай, навукова-папулярнай, адукацыйнай, мастацкай літаратуры, non-fiction. Дызайн дзіцячых кніг.

Віды кніжных ілюстрацый. Мастакі-ілюстратары дзіцячых кніг. Форма і фармат выданняў. Унікальныя і незвычайныя выданні. Экслібрыс.

Актуальныя трэнды ў вёрстцы і дызайне кніг. Прыклады новых фарматаў дызайну кніг: лепшыя дызайнерскія работы. Славутыя беларускія мастакі-графікі Валерый Славук, Уладзімір Малахаў, Уладзімір Васюк, Вячаслаў Валынец, Уладзімір Вішнеўскі і інш. Мастацкае афармленне сучаснай беларускай кнігі. Міжнародныя выставы.

*Тэма 25. Новыя фарматы кніг*

Сучасныя кнігі з аб'ёмнымі ілюстрацыямі і іх віды. Інтэрактыўныя кнігі з высоўнымі элементамі. Фліпбэк як новы фармат кнігі. Неавінтажная кніга: спосабы стылізацыі пад даўніну. Інтэр'ерныя і іміджавыя выданні. Індыкнігі. Антыбука: крэатыўная вокладка. Партворк: віды, тэматыка і прыклады. Кнігля як выяўленча-вербальны комплекс. Вімельбухі: кнігі без слоў. Фастбукі і іх віды. Мастацкія кнігі-нататнікі. Фліпбукі: спосабы выраблення. Віды электронных кніг. Аўдыёкнігі. Гібрыдныя выданні: спалучэнне элементаў электроннай і друкаванай кнігі.

Тэндэнцыі развіцця фарматаў дзіцячых кніг. Віды інтэкрактыўнай дзіцячай кнігі. Кнігі, якія размаўляюць і спяваюць: спосабы выраблення. Кнігі-трэнажоры, кнігі з пальчыкавымі лялькамі, кнігі-размалёўкі, кнігі з тканіны і фетру, кнігі-пазлы, кнігі-канструктары і іншыя фарматы сучасных развіццёвых кніг. Кнігі-прыгоды і кнігі-даследаванні, іх асаблівасці. Сучасныя дзіцячыя кнігі-панарамы (pop-up books). Кнігі для творчасці і іх фарматы. Кніга-тэатр як асобны від. Дзіцячыя кнігі з выкарыстаннем лічбавых тэхналогій. Тэхналогія стварэння 3d-кніг і кніг з дапоўненай рэальнасцю. Дзіцячыя 5d-кнігі. Перспектывы развіцця гібрыдных выданняў для дзяцей.

*Тэма 26. Лічбавае чытанне*

Працэсы лічбавай трансфармацыі кніжнай культуры. Тэхналагічны фактар у развіцці культуры чытання. Паняцце лічбавага чытання. Нейрафізіялагічныя, сацыяльна-культурныя, кагнітыўныя, псіхалінгвістычныя параметры лічбавага чытання. Параўнальныя даследаванні лічбавага і аналагавага чытання. Вывучэнне чытання ў розных лічбавых асяроддзях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасныя практыкі медыйнага і сеткавага чытання. Тыпы лічбавага тэксту: мона– і мультымадальны, адкрыты і закрыты, транзакцыйны і нетранзакцыйны і інш.). Працэсы лічбавага чытання: навігацыя, ацэнка, інтэграцыя. Кагнітыўныя і чытацкія навыкі пры рабоце з лічбавым тэкстам. Патрабаванні да работы з лічбавым тэкстам: увага, рабочая памяць, выканаўчы кантроль, метапазнанне, эмацыйныя і матывацыйныя аспекты. Сучасныя прылады да чытання і іх функцыянал.

Стратэгіі лічбавага чытання: скімінг, сканаванне, мультымадальнае чытанне. Сеткавыя прасторы чытання і іх характарыстыка. Навыкі паглыбленага ўстойлівага чытання і іх фарміраванне ў лічбавую эпоху. Тэхналогіі прафесійнай ацэнкі чытання. Эфектыўныя стратэгіі падтрымкі чытання і мадэлі камунікацыі з чытачом.

*Тэма 27. Лічбавае кнігавыданне*

Гістарычныя і тэхналагічныя падыходы да лічбавага кнігавыдання. Выдавецкая дзейнасць як працэс. Выдавецкія анлайн-сістэмы (Ridero, Bookscriptor, Литео, Bookvika і інш.). Менеджмент у выдавецтве інтэрактыўных кніг. Underpage: сэрвіс і лічбавае выдавецтва. Асаблівасці выдавецкай дзейнасці на лічбавай платформе Ridero.

Вытворчасць лічбавай кнігі. Праектаванне кнігі рэдактарам-складальнікам. Асаблівасці работы рэдактара з аўтарскім зборнікам, тэматычным зборнікам, вучэбным дапаможнікам. Работа з апаратам кнігі. Спецыфіка вытворчасці электронных кніг у параўнанні з друкаванымі і аўдыёкнігамі. Асноўныя віды электронных кніг: лічбавыя рэплікі, кнігі-файлы, пашыраныя электронныя кнігі, кнігі-праграмы або кнігі-сайты (вэб-кнігі). Тэхналогіі падрыхтоўкі розных відаў электронных кніг. Рэгуляванне аўтарскіх правоў. Юрыдычнае суправаджэнне лічбавага кнігавыдання.

Тэхналогія вёрсткі кнігі ў фармаце EPUB. Характарыстыка фармату і спосабы чытання. Канвертацыя. Спецыялізаваныя рэдактары для EPUB-файлаў. Падрыхтоўка макета ў InDesign: падрыхтоўка тэксту, шрыфтоў, ілюстрацый, кампаноўка паслядоўнасці файлаў, падрыхтоўка зместу, фарматаванне абзацаў і сімвалаў, дабаўленне метаданых кнігі. Канвертацыя ў EPUB: настройкі экспарту. Работа з EPUB пасля экспарту.

Стратэгіі прамоцыі і продажу лічбавай кнігі. Кніжны маркетынг ў лічбавым асяроддзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 28. Сучасныя кніжныя сервісы*

Кніжны рынак ва ўмовах лічбавізацыі: асноўныя трэнды. Тэндэнцыі развіцця лічбавай кнігі. Фарматы, якасць і асартымент лічбавых кніг. Праблема пошука і выбару кнігі. Сістэмы агрэгацыі і распаўсюджвання лічбавых кніг. Сеткавыя дадаткі для чытання і праслухоўвання кніг. Кніжныя мабільныя дадаткі і іх функцыянал. Параўнальная характарыстыка мабільных сэрвісаў для чытання лічбавых кніг.

Агляд электронных бібліятэк і сэрвісаў для скачвання кніг. Беларускія інтэрнэт-кнігарні: OZ.by, KNIHI.BY, читатель.by, Тэхналогія, Янушкевіч і інш. Кнігі ва ўніверсальных інтэрнэт-крамах: статыстыка і трэнды. Рэкамендацыйныя сэрвісы і інтэлектуальныя IT-сістэмы. Стратэгіі ўплыву на чытача. Выбар інструментаў і ацэнка іх эфектыўнасці.

Чытацкія сацыяльныя і рэкамендацыйныя сэрвісы. Глабальная сетка аматараў чытання Goodreads: функцыі, сэрвісы і тэхналогіі. Пошук, ацэнка і рэцэнзаванне кнігі. "Паліцы з кнігамі" на Goodreads. Рэкамендацыйны сэрвіс і сацыяльна-камунікатыўныя інструменты. Лента сувязі паміж чытачамі. Віджэты Goodreads. Сацыяльныя платформы Livelib, Bookmate, Wattpad, BookMix, Goodbooks: місія, структура і функцыянал. Асаблівасці камунікацыі ў чытацкіх сацыяльных сетках.

*Тэма 29. Кніжная, інфармацыйная і медыйная культуры: стратэгіі ўзаемадзеяння*

Падыходы да вызначэння медыя- і інфармацыйнай культуры. Кампаненты інфармацыйнай культуры. Асноўныя тэндэнцыі развіцця інфармацыйнай культуры. Нарастанне значэння дзейнаснага кампанента (інфармацыйныя і чытацкія паводзіны). Змяшчэнне акцэнту з тэхналагічных аспектаў работы з інфармацыяй на ацэнку яе змястоўных і каштоўнасных уласцівасцей. Сінтэз інфармацыйнай, візуальнай і медыйнай пісьменнасці, сеткавай культуры, транспісьменнасці, камунікатыўнай кампетэнтнасці і інш.

Культура чытання як базавы элемент кніжнай, інфармацыйнай і медыя культуры. Інфармацыйная культура асобы і чытанне ў кантэксце інтэгратыўнага падыходу IFLA і UNESCO да медыя і інфармацыйнай пісьменнасці. Трансфармацыя культуры чытання і яе асноўных складнікаў. Узаемадзеянне кніжнай і экраннай культур.

Метакампетэнцыі чытацкай, інфармацыйнай і медыйнай пісьменнасці: здольнасць аналітычна ацэньваць і верыфікаваць інфармацыю, разумець і інтэрпрэтаваць тэксты розных жанраў, свабодна дзейнічаць ва ўмовах плюральнай сеткавай рэальнасці з нарастаючым уплывам аўдыёвізуальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сродкаў. Культура чытання новага тыпу як механізм фарміравання асобаснага стаўлення да свету на аснове выпрацоўкі ўласных крытэрыяў адбору, прачытання і інтэпрэтацыі тэкстаў.

### *Тэма 30. Кніга як аб’ект сучаснага мастацтва*

Кніга як арт-аб’ект. Кнігі-скульптуры Ніно Арланды. Вобразы кніг у акварэльных работах Джонатана Уолстэнхолма. Зборнік санетаў Райманда Кено. Кніжныя эксперыменты Джонатана Фоера. Чароўныя кнігі-карціны Марціна Фроста. Кнігі-перфомансы: кніга са спецыямі Ніка Бамптана, кнігі-расліны Ёханэс Хэлдэн, кніжныя пейзажы Кайла Кіркпатрыка, нана-кнігі і кнігі-гіганты. Лічбавыя кнігі-трылеры з таймерамі зваротнага адліку. Кнігі з сэнсарнымі прыладамі: спробы перадачы эмоцый персанажаў.

Дызайнерскі стыль кніжнай імітацыі (faux book). Прадметы інтэр’ера ў выглядзе кніг. Вобраз кнігі ў архітэктурных праектах і элементах гарадскога асяроддзя. Скульптурныя кампазіцыі і маштабныя інсталяцыі з кніг. Вежа-спіраль з кніг у Буэнас-Айрэсе, інсталяцыя “Сканар” Мацея Крэна, арт-праект “Літаратура vs трафік” у Нью-Ёрку, серыя “Бібліяграфіі” Алісіі Марцін, галандскі арт-праект Анук Крэйтхоф і інш.

Практыкі мастацкага выразання з кніг (бук-карвінг) і неадназначныя ацэнкі публікі. Літаратурныя і кніжныя графіці. Праекты па сінтэзу літаратурных твораў з вулічным мастацтвам. “Літаратурняа прыстунасць” у гарадскім асяроддзі: інтэрактыўныя дызайнерскія праекты.

### *Тэма 31. Рэклама і прамоцыя кнігі*

Кніга як аб’ект рэкламы. Спецыфіка кніжнай рэкламы. Унутраныя элементы рэкламавання кнігі: аўтарства, жанр, назва, анатацыя, мастацкае афармленне кнігі і інш. Кніжная анатацыя як рэкламны тэкст: правілы састаўлення. Знешнія элементы рэкламавання: рэкламныя праспекты, плакаты, прэс-рэлізы, бібліяграфічная прадукцыя, прэзентацыі і інш.

Сучасныя формы рэкламавання кнігі. Мультымедыя і тэатралізацыя ў прамоцыі кнігі. Інтэрактыўныя фарматы рэкламы і прамоцыі кніг. Прэзентацыя кнігі як тып мерапрыемства. Патрабаванні для публічнай прэзентацыі кнігі. Асаблівасці рэкламы і прамоцыі кнігі ў бібліятэках. Віды сучасных кніжных выстаў. Літаратурныя квэсты, гульні, майстар-класы, перфарматыўныя экскурсіі, кніжныя сустрэчы і іншыя формы бібліятэчных мерапрыемстваў па прамоцыі кнігі і чытання.

Экранізацыя і віртуалізацыя кнігі: актуальныя падыходы. Рэклама і прамоцыя кніг у сеткавым асяроддзі. Асноўныя каналы прамоцыі кніг:

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

кніжныя (літаратурныя) каналы і паблікі ў сацыяльных сетках, відэаблогі, кніжныя падкасты, сайты бібліятэк, выдавецтваў і пісьменнікаў. Медыяфарматы рэкламы і прамоцыі кніг: відэаагляды, падкаст-серыі, віртуальныя выставы і прэзентацыі, буктрэйлеры і інш. Кніжны і літаратурны сторытэлінг.

Комплексныя формы прамоцыі кніг і чытання. Кніжныя фестывалі, акцыі і івэнты ў Беларусі. Крэатыўныя падыходы да рэкламы кніг і чытання: сусветны і беларускі вопыт.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ (ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ДЗЁННАГА НАВУЧАННЯ)

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | | |
| Уводзіны | | | | | |
| **Раздзел І. Гісторыя кнігі і кніжнай культуры** | | | | | |
